Cana 10 hr. Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 37 (678). Wilnia, Čaćwier 3 Wieraśnia 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

ТРЭБА АЖЫВІЦЬ ШКОЛЬНЫ ФРОНТ

Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры і Таварыства Беларускай Школы, як ведама, аб‘ядналіся, каб супольнымі сіламі бароцца за беларускую школу. Аб‘яднаная гэта праца дала дужа памысныя вынікі. У беларускім жыцьці наступіла вялікае ажыўленьне. Беларуская вёска, так культурна апушчаная і забытая, з нагоды школьнай акцыі ажыла нязвычайна. Усюды зазначаецца ажыўленае складаньне школьным уладам дэклярацыяў на беларускія школы.

Беларускай школы жадаюць усе: праваслаўныя і каталікі. Першыя аднак у гэтай справе больш актыўныя, другія—пасыўныя. І гэта зразумела —- псыхіка беларуса каталіка больш асвоена — не асымілявана! — з польскасьцяй, дык яму яўна дамагацца таго, за што трэба стойка выказвацца прад польскімі ўладамі і што не падабаецца паном і ксяндзом — неяк «не выпадае». Агулам-жа, прынцыпова, сваім псыхічным настроем да беларускай школы ня розьніцца беларус каталік ад беларуса праваслаўнага. І каталікі і праваслаўныя ў адзін голас паўтараюць, што беларускім дзецям у польскіх школах вучыцца дужа цяжка, што дзеля гэтага вынікі гэтай навукі нязначныя і што для іх дзяцей патрэбная школа родная, беларуская.

Аднак зварачваем увагу нашага грамадзянства, што школьная акцыя сярод беларусаў каталікоў у кірунку складаньня школьных дэклярацыяў ідзе даволі слаба і што так ці гэтак, але яе трэба абавязкава ажывіць. Калі беларусы каталікі яшчэ масава не складаюць дэклярацыяў на беларускія школы, на што маюць свае прычыны, дык трэба, каб узяліся за беларускую асьветную працу пазашкольную. Гэткую працу беларусы каталікі добра разумеюць, хочуць яе і гэткая праца для іх варункаў сусім магчымая.

Не адрэчы будзе тут зазначыць, што каб ажывіць культурны фронт сярод беларусаў каталікоў, асабліва ў галіне пазашкольнай асьветы, трэба на гэта мець адпаведную літаратуру. Маем тут на думцы беларускі лемантар - граматку лацінкай. Праўда, сярод беларусаў патрэбу гэткай літаратуры разумеюць ня ўсе. Спатыкаюцца нават галасы, што лацінка для беларусаў ёсьць шкоднай, бо ў апошнім выніку ўсё-ж вядзе беларуса каталіка, які ёй мае карыстацца, да полёнізацыі. Нам аднак гэта справа прадстаўляецца інакш. Мы ўважаем, што калі беларус каталік сяньня яшчэ староніцца гражданкі і калі многія, выкарыстваючы гэтую яго нясьведамасьць, гражданкай адстрашаюць яго ад беларускасьці, дык трэба беларусу каталіку, прынамсі часова, даць беларускую літаратуру лацінкай і адкрыць яму сьвет на беларускую праўду. Далей справа сама выясьніцца, а покульшто важней зьмест, як форма. Вось-жа маем ужо беларускую граматку («Першыя зерняткі») гражданкай; абавязкава трэба выдаць нешта падобнае, або й тое самае, і лацінкай. Але гэта справа належа да асьветы пазашкольнай і да гэтай яшчэ вернемся няраз. Тут мы аб ёй успамінаем толькі ў сувязі з справай большага ажыўленьня школьнай акцыі сярод беларусаў каталікоў.

Пачатак школьнай акцыі — складаньня дэклярацыяў на беларускія школы — адносіцца да сакавіка месяца сёлета. Першыя тры месяцы — сакавік, красавік і травень акцыя гэта ішла сапраўды ўсей парай. Былі проста гэроічныя выпадкі. Труднасьці так-жа страшэнныя. Аб гэтым не гаворым тут нічога... Ды аб гэтым народ наш і грамадзянства ведае дужа добра. Успомнім толькі, што войты, звычайна, дэклярацыяў не пацьверджаюць, бо кажуць, што пацьверджаць ня маюць загаду, або проста адсылаюць да натарыюсаў, якім трэба плаціць грошы. Не дабіўшыся пацьверджаньня подпісаў, што вымагаецца правам, беларускія сяляне пасылаюць гэныя дэклярацыі без пацьверджаньня школьным уладам і ў беларускі Школьны Сакратарыят.

Ня гледзячы аднак на рознага роду труднасьці, школьная акцыя складаньня дэклярацыяў— паўтараем — за тры веснавыя месяцы разьвівалася сапраўды памысна. Пасьля выданьня адозвы БІГІК і ТБШ аб дамаганьні роднае школы, хутка пачалі атрымліваць, як гэтыя арганізацыі, так і Школьны Сакратарыят, пісьмы з розных кутоў аб прысылцы дэклярацыяў, адозваў, інструкцыяў і інш. друкаў што да школьнае акцыі. Сакратарыят безадкладна высылаў гэныя друкі ў прошанай колькасьці. Апрача гэтага друкі былі выдаваныя і беспасрэдна на рукі пасланцам з некаторых вёсак. Выданы так-жа школьныя друкі больш як трыццацём студэнтам-беларусам перад ад‘ездам іх на Вялікодныя сьвяты. Усяго выдана і выслана дэклярацыяў за ўспомненыя веснавыя месяцы 27,171, заяваў — 1,259, інструкцыяў 1,205, адозваў да народу 677. Усе гэтыя друкі пайшлі пераважна ў паветы: Навагрaдзкі, Ваўкавыскі, Маладэчанскі, Баранавіцкі, Горадзенскі, Слонімскі і інш.

У летніх месяцах з прычыны працы ў полі школьная акцыя была значна прыціхшы. Праўда, яна сусім не заціхла і летам, адбывалася далей і, спадзяёмся, што Школьны Сакратарыят у хуткім часе падасьць да публічнага ведама цікавую справаздачу і за летні час, аднак факт астаецца фактам, што за гэты час школьная наша справа прыціхла і што трэба яе ажывіць нанава. Наступае восень, палявыя работы канчаюцца, селянін мае больш вольнага часу і гэты час трэба выкарыстаць для школьнай справы. Больш спрыяючы школьнай акцыі цяпер час і ў Вільні. Цяпер узноў зьбіраецца тут беларуская інтэлігенцыя пасьля летняга адпачынку і нанава бярэцца за беларускую працу. Словам, настаў адпаведны час ажывіць узноў беларускую школьную акцыю. На нашую думку трэба дзеля гэтай справы зрабіць безадкладна наступнае: а) ажывіць складаньне дэклярацыяў, б) выдаць аднаднёўку аб дасюлешнім ходзе школьнай акцыі, падаючы парады далейшае працы, в) Школьны Сакратарыят павінен апрацаваць мэмарыял аб патрэбе беларускай школы і аб дасюлешняй школьнай акцыі і падаць яго праз адумысловую дэлегацыю польскім школьным і адміністрацыйным уладам: прэм‘ер-міністру, міністру асьветы, школьнаму куратару віленскага вокругу, а так-жа навуковым, культурным і грамадзкім установам.

На заканчэньне яшчэ некалькі ўвагаў. Многім здаецца, што ўдарным школьным годам для беларусаў мае быць толькі год гэты—сёлетні, што даволі правесьці школьную акцыю ў гэтым годзе, а пасьля можна будзе ўжо аддыхаць і чакаць, калі польскія ўлады дадуць нам беларускую школу. Не! *Беларускі народ і яго інтэлігенцыя ня мае права ў школьнай працы аддыхаць аж покуль свае школы не здабудзе сапраўды. Прапануем абдумаць плян пастаяннай, беспрарыўнай беларускай школьнай акцыі...*

Z kaścielnaha žyćcia

Dziesiać hadoŭ arcybiskupam u Wilni.

Praz wilenskuju biskupskuju stalicu mnoha biskupaŭ pierajšło ŭ historyi. Biskupstwa ŭ kaściele heta ważnaje i wysokaje stanowiśča. Na biskupski pasad tolki adpawiednych ludziej wybirajuć i dapuščajuć. Bywała adnak, što hetyja adpawiednyja ludzi prakudzilisia i nie adkazali swajmu wysokamu stanowišču. Dziesiać hadoŭ tamu ŭzad, Wilenskaja archidyjecezija dastała sabie arcybiskupa Romualda Jałbžykoŭskaha. Pryjechaŭ jon da nas z Mazurščyny i jahony polski charaktar nie zhadžajecca z biełaruskim charaktaram jahonych awiečak.

Praz dziesiać hadoŭ arcybiskup Jałbžykoŭski ŭ nas nie pramowiŭ ani adnaho biełaruskaha słoŭca. Dla nas biełarusaŭ heta jość duža charakterny fakt. Arcybiskupy, papiaredniki hetaha, jak Ropp i Matulewič wielmi achwotna pabiełarusku hawaryli pry wizytacyjach i tak. Bo heta naturalnaja reč dla arcybiskupaŭ da biełarusaŭ hawaryć pabiełarusku. Henyja arcybiskupy widać druhimi sposabami padchodzili da swaich awiečak. Nam zdajecca, što awiečak da pastyra zbližaje nadta toje, kali awiečki z wusnaŭ swajho pastyra čujuć swajo rodnaje słowa. My nie žadajem taho, kab sučasny arcybiskup hłybaka wučyŭsia biełaruskaj mowy i da nas ad pačatku da kanca pramaŭlaŭ pabiełarusku. Choć papiaredniki hetaha arcybiskupa prabawali nie-šta rabić i ŭ hetaj miery. My chacieli-b prynamsi ad hetaha arcybiskupa pačuć biełaruskich słoŭ niekalki i pabačyć prychilnaje da biełarusaŭ jahonaje serca.

Arcybiskup Ropp da duchawienstwa swajho napisaŭ duža pryhožy list, u jakim jon prychilna ab biełaruskaj mowie hawora. Tam na probaščaŭ jon kładzie abawiazak, kab hetaj mowaj u kaściele karystalisia. Hetu radu i zahad arcybiskupa Roppa biełarusy naležna acanili i dobra jaho wykarystali. Za heta biełarusy asobu arcybiskupa Roppa wysaka ŭważajuć i buduć uważać.

Druhi arcybiskup Matulewič taksama dla biełarusaŭ zrabiŭ mnoha. U niekatorych parachwijach jon praŭna zaćwierdziŭ na stałaje ŭžywańnie biełaruskaj mowy ŭ dadatkowych nabaženstwach. I niejak tady dobra z hetym usiudy było! Pa rasiejskaj rewalucyi biełaruskaje relihijnaje žyćcio katalikoŭ pakaciłasia swajej naturalnaj darohaj. Ažywiŭsia narod, pačuŭ u sabie relihijnuju siłu. Ale heta tryvała koratka. Z taho času ŭžo dziesiać hadoŭ, jak z biełaruskich parachwijaŭ čyściusieńka wywiedziena ŭ dadatkowych nabaženstwach biełaruskaja mowa. I heta rabota ŭ kaściele wypała akurat na toj čas, kali ŭ Wilni na arcybiskupski pasad zasieŭ arcybiskup R. Jałbžykoŭski. Kažuć, što heta tonkaja palityka: uwodzić u kaścioł, abo wywodzić z kaścioła biełaruskuju mowu. Kali heta jość tak, dyk my biełarusy, wiedajem, što palityka henych papiarednich dwuch arcybiskupaŭ była lepšaja, jak palityka hetaha sučasnaha arcybiskupa.

Arcybiskup Romuald Jałbžykoŭski, idučy pa linii polskaj, ad biełaruskaha narodu adłučaje biełaruskich ksiandzoŭ. Na tych parachwijach, hdzie daŭniej pabiełarusku pracawali biełaruskija probarščy, ciapier tam ich miescy zanjali probarščy-palaki. A hdzie-ž padzielisia henyja biełaru-

skija probarščy, što piarwiej siarod swaich pracawali? Niama ich pry swaim narodzie!

Tymčasam wialiki pracent biełarusaŭ-katalikoŭ pierastali chadzić u kaścioł i praktykawać swajo relihijnaje žyćcio. Jość wyrazny adchił ad wiery. Biełaruskaja duša ściwiardzieła. U joj znajšoŭsia niejki mocny adpor na ŭsio ŭ kaściele polskaje. Hrachi i kiepskija nałohi siarod biełarusaŭ pašyrylisia. A tymčasam kamunisty da biełarusaŭ prychodziać i swaju nawuku biełarusam niasuć u rodnaj biełaruskaj mowie. Baptysty, ab jakich u nas dahetul nie čuwałasia, prychodziać siańnia ŭ biełaruskuju wiosku i pabiełarusku nam piajuć swaje pieśni. Tolki my, kataliki, nia majem mahčymaści pabiełarusku ŭ kaściele piajać swaich pieśniaŭ i słuchać katalickich nawuk.

Katalik.

Z hazet.

Ziamielnaja „reforma".

Apošnim časam roznyja polskija palityčnyja partyi zahawaryli ab tym, jak sabie pradstaŭlajuć ziamielnuju reformu. Jak zaŭsiody bywaje, tak i hetym razam adny wykazwajucca prociŭ reformy (prociŭ padziełu kazionnych, panskich i kaścielna-carkoŭnych ziemlaŭ), a druhija za takuju reformu. Čaho sapraŭdy moža biełaruski sielanin ad hetaj reformy spadziawacca, pakazała anahdaj wilenskaje „Słowa" (Nr. 233), pišučy ŭ artykule „Czas najwyższy z tem skończyć" dasłoŭna hetak:

„...My nie praciŭniki parcelacyi tam, dzie hetaha wymahaje dabro dziaržawy. **Pawialičeńnie elementu, ale tolki polskaha na Kresach** zaŭsiody znojdzie spohad u patryjatyčna dumajučym hramadzianstwie. Majem majontki dziaržaŭnyja (jakija, praŭda, dajuć słabyja dachody), majem i dwary prywatnyja, jakija z tej ci inšaj pryčyny pawinny być rasparcelawany, **kab pabolšyć polskaść na Kresach** (padčyrknuli my — red. „B.Kr.), ale, jak heta kolki razoŭ było zaznačana, musić hetki asadnik adčuwać, što maje nad saboj **uradawuju apieku**, musić stajać ćwiorda na nahach, musić mieć dobruju haspadarku (dom, a nia hlinianku), žywy i nia žywy inwentar, bo tady tolki, u razie niebiaśpieki, budzie z całaj siły baranić swajej majemaści"...

Hetak polskija abšarniki pradstaŭlajuć sabie „reformu" ziamiel, zasielenych Biełarusami.

БЕЛАРУСЫ! Падтрымлівайце сваю прэсу. Выпісвайце найстарэйшую беларускую газэту „Беларускую Крыніцу!"

Рэвалюцыянэры контрэвалюцыянэрамі

Прысуд сьмерці ў Маскве.

Ад 19 да 24 жніўня адбываўся ў Маскве вялікі палітычны працэс, які закончыўся прысудам сьмерці ўсіх падсудных.

Гэты працэс выяўляе надзвычайна ярка палажэньне камунізму ў СССР.

Самыя падсудныя ў гэтым працэсе паказваюць на ўпадак сваей годнасьці; паіменна: Зіноўеў-Апфэльбаўм, колішні старшыня Камінтэрну і быўшы кіраўнік рэвалюцыйнай прапаганды ва ўсім сьвеце, другі падсудны Каменеў — Розэнфэльд, б. віцэ-старшыня Рады Народных Камісараў СССР., трэці Смірноў, б. прэм'ер СССР і 13 іншых падсудных, якія займалі высокія становішчы ў камуністычнай партыі і ў дзяржаўнай герархіі СССР.

Акт абвінавачаньня цьвердзіць, што Зіноўеў, Каменеў, Еўдокімаў і Бакаеў былі беспасрэднымі арганізатарамі забойства Кірова, які забіты 1.I.1934 г., і гатовілі забойства іншых дастойнікаў савецкага ўраду; дзеялі яны ў паразуменьні з Троцкім, які так-жа, як контррэвалюцыянэр выгнаны з СССР і прабывае цяпер заграніцай. Троцкі і троцкісты, Зіноўеў і зіноўеўцы — цьвердзіць акт абв. — у 1932 г. стварылі арганізацыю „Аб'ядньаны Цэнтр," які пачаў барацьбу з кампартыяй пры помачы тэрору. Меліся забіць: Сталіна, Варашылава, Кагановіча і іншых дастойнікаў сучаснага рэжыму ў СССР.

Падчас судовага працэсу ўсе падсудныя „шчыра" да ўсяго, што ім акт абвінавачаньня закідаў, прызналіся і яшчэ больш сябе вінавацілі. У абвінавачваючай прамове пракурор называў падсудных „бандытамі" і зажадаў для іх кары сьмерці такімі славамі — „гэтых шалёных сабак трэбую растраляць."

Падсудныя ўсе выказвалі пакаяньні за свае правіны і ў спосаб, неразумелы для эўрапэйскай псыхікі, аплёўвалі самі сябе, мяшалі з балотам сваю дзейнасьць, абдзіралі з чэсьці сваіх павадыроў і супрацоўнікаў, складалі чалабітныя прызнаньні ўсім кіраўнікам сучаснага ўраду ў СССР і кампартыі, а прадусім Сталіну. Пры гэтым усе падсудныя, прызнаючы сябе вінаватымі, хвалілі і прызнавалі сталінаўскую палітыку правільнай, а сваю дзейнасьць называлі здрадніцкай і супрацоўніцтвам з нямецкай гітлераўскай паліцыяй; адначасна выяўлялі сваіх супрацоўнікаў, якія дасюль былі на волі і аб якіх ніхто ня ведаў, што яны стаяць у апазыцыі да цяперашняга рэжыму. Агулам, усе прамовы падсудных ня маюць нічога супольнага з людзкой годнасьцяй і ясна паказваюць як нізка ўпалі павадыры расейскай рэвалюцыі. Падсудныя прадпрысудам заяўлялі, што яны прызнаюць згары прысуд над імі справядлівым і плююць на апінію адносна гэтага прысуду заграніцай.

Прысуд і выкананьне.

Судавы трыбунал пасьля 7-гадзіннай нарады выдаў прысуд, якім усіх 16 падсудных з Зіноўевым і Каменевым на чале засудзіў на кару сьмерці праз растраляньне. Адначасна суд загадаў арыштаваць і аддаць пад суд Троцкага, калі-б ён паявіўся на тэрыторыі СССР, а так-жа арыштаваць і аддаць пад суд усіх тых, каторых выявілі падсудныя, як сваіх супрацоўнікаў.

Пасьля прысуду 25 г. м усіх 16 падсудных у Маскве на вастрожным дварышчы растралялі.

Эўрапэйскі гуманітарызм і бальшавіцкая „маральнасьць"

Гэты крывавы, ўзаемна мардуючы бальшавіцкі працэс выявіў апрача нізкасьці самацэннасьці людзкой годнасьці падсудных, б. павадыроў камуністычнай партыі ў СССР, так-жа і маральны упадак камуністычных нізоў.

Пасьля абвешчаньня сьмяротнага прысуду, прэзыдыюм II Социялістычнага Інтэрнацыяналу і Міжнародны Прафэсыянальны Саюз выказалі Савецкаму ўраду сваё спраціўленьне, што савецкі ўрад падняў гэткі працэс тады, калі цэлая работніцкая маса аб'ядньваецца ў духу салідарнасьці з гішпанскімі работнікамі і адзначыўшы, што хоць засуджаныя былі заўсёды ворагамі II Соц. Інтэрнацыяналу, падпісаныя ад імя II Інтэрнацыяналу і Міжн. Праф. Саюзу, стаяць проціў кары сьмерці для засуджаных і дамагаюцца ад гэтага прысуду апэляцыі.

Гэта голас эўрапэйскіх соцыялістаў.

А савецкія соцыялісты, ўзгадаваныя засуджанымі Зіноўевым, Каменевым і „прававерныміˮ сталінцамі, падчас працэсу і пасьля прысуду дамагаліся з нізоў, з фабрыкаў і заводаў прысуду сьмерці і безадкладнага яго выкананьня.

Арышты троцкістаў і правай апазыцыі.

Адначасна, калі ў Маскве растрэлівалі засуджаных, у Ленінградзе і ва ўсіх гарадох СССР пачаліся арышты супрацоўнікаў з засуджанымі і прыхільнікаў Троцкага г. зв. „троцкістаў."

Адбыліся і адбываюцца арышты „троцкістаў" і ў Савецкай Беларусі, дзе гэтымі „троцкістымі" былі абсаджаны ў 75 проц. вышэйшыя і ніжэйшыя ўрадавыя ўстановы.

У Савецкай Беларусі гэтыя-ж «троцкісты,» насьлядоўнікі засуджанага і растрэленага разам з Зіноўевым тэорэтыка камунізму Тэр—Ваганіяна, які стварыў тэорыю агульнасавецкай культуры і агульнасавецкага народу дзеля ўстрыманьня разьвіцьця нерасейскіх народаў у СССР, разграмілі беларускія нацыянальна-культурныя асяродкі, ператвараючы іх на кузьні агульнасавецкай культуры — „нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зьмесьце" — і гэтак пачалі ператвараць беларусаў у агульнасавецкі народ.

Адначасна з арыштамі левай апазыцыі адбываюцца арышты і правай апазыцыі ўнутры камуністычнай партыі.

Між іншымі арышаваныя ўжо Рыкаў, Сакольнікаў, Бухарын і Радэк.

„Сьмерць камуністычнай партыі."

Маскоўскі працэс скалыхнуў нэрвы (ня сумленьне, не) старых бальшавікоў. Томскі, які трымаўся стараны Троцкага і каторы быў калісь старшынёй Прафсаюзу ў СССР, надовячы павесіўся.

Даведаўшыся аб самагубстве Томскага, Троцкі публічна сказаў — сьмерць Томскага і сьмяротны маскоўскі працэс маюць вялікае палітычнае значэньне: гэта сьмерць цэлай бальшавіцкай партыі, яе традыцыі і праграмы.

Пасьля растраляньня 16 засуджаных, Троцкі заявіў прадстаўнікам прэсы наступнае:

„Абвінавальнікі ня мелі другога выхаду і муселі растраляць абвінавачаных. Каб хоць адзін з іх астаўся жывы, мог-бы некалі разарваць сетку, якую спляло ГПУ. Дзеля гэтага заткнулі ім рот назаўсёды.

Але я, хоць намагаліся з мяне зрабіць галоўнага вінаўніка, астаўся жывы. Мая быццам тэрорыстычная дзейнасьць мела разьвівацца ў Францыі, Даніі й Норвэгіі. Праступства, якое мне закідалі, у гэтых краёх караецца. Магчыма, што мяне будуць судзіць. Маю абавязак выказаць многае і адамсьціць аднаму найбольшаму праступству на сьвеце."

Троцкі і 16 растрэленых.

Пасьля сьмерці Леніна, Троцкі, Каменеў, Зіноўеў і многія іншыя камуністычныя павадыры пачалі выказваць незадаваленьне з сталінаўскай палітыкі і стварылі г. зв. левую апазыцыю ўнутры камуністычнай партыі.

Трэба прызнаць, што троцкісты ня менш радыкальныя і ня

В. Д—а.

ЗА РОДНУЮ ШКОЛУ!

Была восенская субота, зараз неяк па другой Прачыстай, куды яшчэ перад усімі сьвятымі. Вёска Буда прыгожа залацілася лістамі жоўтых дрэў. Усюды кругом было надта ціха. У паветры восенскага павучыньня плавала ўдоваль. Па лясох цьвіцеў прыгожы беларускі верас. Гадзіна бралася пад палудзень. Невялічкі гаспадар Якуб у сянёх цярабіў буракі і праз адчыненыя дзьверы хаты гаварыў з сваей жонкай, якая парадкавала агуркі на саленьне.

—Вось табе і беларуская школа! —казаў Якуб.— Ага, якраз так і будзе, мы папрасілі, а яны нам далі! Што там аб гэтым і гаварыць доўга, як была ў нас польская школа, так яна і асталася!

Якуб замаўчаў і жонка ягоная маўчала.

— Міхалінка, ці чуеш ты, я ўзноў да цябе пра нашу беларускую школу?—казаў далей Якуб.

— А няўжо-ж! — пачуўся з хаты жаночы голас.

— Што гэта будзе з гэтага, што мы б'ёмся, трацімся, стараемся...

У дзьвярох з вялізарным агурком у руках паказалася Міхалінка, мілая беларуская кабеціна, гадоў пад сарачню з нечым. Дробненькая высахшы, нявысокага росту, з белай на галаве хустачкай, у сіняй накідцы і чорнай спадніцы, з блакітным жаночым фартухом. Міхалінка паказывала мужу агурок і казала:

— Вось, ты моц Божая, вырасьце ў гародзе гэтакае! І з такога маленькага зярняці! Так, здаецца, нядаўна я садзіла яго маленькае, а цяпер глядзі вун што, вываліў, як добрае парасё якое!

Якуб Сырыда адкашляўся і нічога не сказаў на гэта. Гэта быў чалавек, гадоў за 50, высокага росту, з чорнымі вусамі і з бародкай. Якуб сядзеў у буракох і разглядаўся па высокай іх крушні. Ён гэтак седзячы, ваяваў з буракамі. Буракам ён галовы скручываў, адразаў ім плешкі і кідаў буракі ў вялікі цэбар, каб там іх мыць, а пасьля ў кадушку класьці. Адзін па другім у яго бурак пераваліваўся ў цэбар.

— А я з табой усё хачу гаварыць пра школу — Якуб пачаў да жонкі.

— Мне шкада сваіх дзяцей. Яны не ў беларускай школе. Малы наш Гіпаліт і наша Гэлька цяпер у беларускай школе вун-бы як карысталі! А так, як у польскай, яны чуць ня дарма там толькі месца займаюць. Наш старшы сын Тамаш нават ужо вун папольску да нас гаварыць пробуе, а толку ніякага. Але што казаць. Каб для нас, ды беларуская школа, тады-бы мы былі-б людзьмі, а інакш... — Якуб сказаўшы гэта, цяжэнька ўздыхнуў, па крушні шукаў ён бураkoў лепшых, а ў гэтым часе разьвяла сваё Міхалінка:

— Што гэта за чалавек такі гэны каратар, у якога мы гэтак просім сабе беларускай школы?

— Пачакай, Міхалінка,— перапыніў яе Якуб — ён не каратар завецца, але куратар, ён гэта такі высокі польскі школьны начальнік.

— Я й сама ведаю, што ён начальнік і польскі — на гэта Міхалінка мужу — дык што яму, вялікаму начальніку, значыцца даць нам беларусам беларускую школу? Раз бацькі яе просяць, дык ён яе нам даць павінен! Бацькаўскае права да сваіх дзяцей куды большае, чым яго куратарскае да нашых беларускіх дзяцей.

Якуб на гэта не адказаў нічога. Ён ўстаў з месца, смаргануў крэпка носам, крыху параўняў свае косьці і працаваў далей. Мыў кадушку, паласкаў яе. А ў гэтым часе ягоная жонка ў хаце даводзіла ўсе да агуркоў прыправы. На лаве ляжалі зялёныя дубовыя лісты, а ў другім месцы вішнёвыя, было там так-жа многа сушанага кропу. Стаяла соль і нешта іншае ў большых і меншых начыньнях.

Якуб з Міхалінай урэшце прыселі адпачыць. Якуб аб школьніцтве і далей гаварыў да жонкі: — Ды цяпер і польскія школы няведама якія! — казаў ён.

— Так, так!—патакнула свайму мужу Міхалінка — Я па сваіх старшых дзецях гэта ўсё бачу. Ужо яны мне ў многім чым не падабаюцца.

— А няўжо-ж — цягнуў далей Якуб — і вучацца цяпер нашы дзеці куды ня так, як даўней. У школе яны бываюць карацей, як мы калісьці былі. Прыйшоўшы да хаты, яны ня вучацца, або надта мала вучацца. Больш толькі бегаюць, крычаць, вадзяцца, а старшаму, дык не дадуць яны выгаварыць і слова!

— Няўжо-ж бы гэтакімі былі дзеці і ў нашых беларускіх школах? —Міхалінка пыталася ў мужа.

— А не, ніколі! Але аб гэтым гаварыць цяпер яшчэ нам рана — закончыў Якуб.

— А вун ужо ідзе і наш Тамаш са школы,— гаварыла Міхалінка, у вакно гледзячы. — У іх ужо і па школе. Самая адзінаццатая, а ён ужо і да хаты вярнуўся. Вот іх і навука там. А ён-жа ў 7 ад-

менш жорсткія за сталінцаў. Яны так-жа не агляданіся і многіх растрэльвалі, калі былі разам з цяперашнімі сталінцамі ў згодзе.

Крывавы спор сталінцаў з троцкістымі гэта сямейныя нялады камуністычнай партыі, якія шкодзяць толькі самой кампартыі.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Суды: 28 і 29 жніўня ў Віленскім Гарадзкім Судзе адбыліся 4 судовыя справы беларускай прэсы. Судзілі рэд. Я. Пазьняка ў справе „Бел. Крыніцы“ і д-ра Ст. Грынкевіча ў справе брашуры „Асьвета.“

У адной справе рэд. Пазьняк засуджаны на 1 месяц арышту, 100 зл. штрафу і 15 зл. коштаў суду; у другой справе—на 1 тыдзень арышту, 100 зл. штрафу і 15 зл. коштаў суду; трэцяя справа праравана да 25 верасьня.

Д-р Грынкевіч засуджаны на 1 тыдзень арышту, 100 зл. штрафу і 15 зл. коштаў суду.

Засуджаныя падалі апэляцыю.

З жыцьця ТБШ. На адбытым у Вільні 5 ліпня сходзе ўкамплектавалася Галоўная Управа ТБШ. У склад Управы ўвайшлі апрача старых сяброў гр. гр. С. Паўловіч, Фр. Грышкевіч, М. Косьцевіч (Васілёк), В. Тумаш і В. Склубоўскі. Склад прэзыдыюму Галоўнай Управы наступны: Ф. Стэцкевіч — старшыня, М. Кэпель і В. Тумаш — віцэ-старшыні, Фр. Грышкевіч — сакратар і Р. Шырма—скарбнік.

З выдавецкай нівы. Нядаўна выйшаў з друку: *„Arhanizacyjny Statut Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia — B.N.A.“* і *„Instrukcyja-parada, jak twaryć arhanizacyi Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia (BNA)“* у аднэй кніжыцы, якая мае 24 бачыны.

Z litoŭskaha žyćcia
ŭ Wilni.

Zakrywajuć i spyniajuć. Administracyjnyja ŭłady dalej zakrywajuć i spyniajuć addziały litoŭskaj arhanizacyi św. Kazimiera i „Rytasa.“ U kožnym numary kožnaj litoŭskaj hazety spatykajucca ab hetym pawiedamleńni.

Memoryjał kardynału Marmadžiamu. Litoŭski Nacyjanalny K-t u Wilni pasłaŭ kardynału Marmadžiamu, z nahody jaho byćcia ŭ Čenstachowie, memoryjał ab tych kryŭdach, jakija litoŭcy daznajuć u relihijnym žyćci.

Kanfiskata. Nr 69 „Viln. Rytojus“ skanfiskawany za ŭstupny artykuł. Pa kanfiskacie wyšaŭ numar 69 a z biełym miescam zamiest ustupnaha artykułu.

Z haspadarskaha žyćcia ŭ Litwie

Padmoha małačarstwu. Sioleta ŭrad małačarstwu praznačyŭ padmohu 197.000 litaŭ. Dzialić hetuju padmohu miž paasobnymi małačarniami budzie Pałata Ziamielnaj Haspadarki. Nowym małačarniam praznačana — 30 tysiač litaŭ, na arhanizawańnie nowych punktaŭ dla źbirańnia śmiatany — 50 tysiač, na byćcio ŭ małačarni pasteryzacyjnych aparataŭ — 10 tysiač, syrnym małačarniam — 6 tysiač, na ŭładžańnie studniaŭ i filtraŭ — 36 tysiač. Aprača hetaha na małačarstwa ŭ Kłajpedzkim krai — 60 tysiač litaŭ.

Padmoha ilniarstwu. Ilniarskaja haspadarka ŭ Litwie pawažna raźwiwajecca i palapšajecca. Sioleta Ministerstwa Ziemlarobstwa praznačyła na ilniarstwa 270 tysiač litaŭ padmohi, katoruju atrymajuć haspadary, što siejać lon i lonam pramyšlajuć. Na palepšańnie starych sušarniaŭ-łaźniaŭ i na ŭładžańnie 130 nowych pa 3—5 u kožnym pawiecie — 208 tysiač litaŭ, na ŭładžańnie adpawiednych mačułaŭ, jakich sioleta maje być arhanizawanych da tysiačy — 40 tysiač litaŭ, na palepšańnie ilnianaha nasieńnia — 7 tysiač i ahułam na hadawańnie lepšaha hatunku lonu — 15 tysiač litaŭ.

Niastača rabotnikaŭ. Jak kožny hod, tak i sioleta, u Litwie enerhična wiaducca melioracyjnyja raboty. Sioleta jany tak šyraka prawodziacca, što ŭ niekatorych pawietach nawat nie staje rabotnikaŭ. Rabotniki pry melioracyi zarablajuć 4—5 litaŭ dzienna.

Zajac panios karowu

U Paswalis na Litwie niadaŭna było cikawaje zdareńnie. Woś-ža sialanka hnała na kirmaš karowu, až na darozie ŭ lesie wyskačyŭ zajac. Žančyna za jaho — zławiła — sputała jamu chustkaj nohi i paniasła z saboj na kirmaš. Pradaŭšy na kirmašy karowu za 150 litaŭ, uziała hetyja hrošy i zawiazała ŭ roh chustki, jakoj byŭ sputany zajac. Wiartajučysia damoŭ, žančyna ŭ darozie na tym samym miescy, dzie zławiła zajca, spatyknułasia i čuć nia ŭpała, a ŭ hety mament zajac wyskačyŭ joj z ruk i ŭciok razam z chustkaj i z hrašmi ŭ lasny huščar.

Źbiedžanaja žančyna źwiarnułasia da laśničaha z prośbaj pamahčy joj znajści hrošy, spadziajučysia, što chustka, katoraj byli abkručany nohi zajca, raźwiazałasia i lažyć dzieś u lesie. Laśničy wysłaŭ na śled zajca sabaku, katory sapraŭdy znajšoŭ chustku z zawiazanymi ŭ wuziałku 150 litami.

З Украінскага жыцьця

Сьвята ў чэсьць а. М. Шашкевіча. Дня 16 жніўня на Белай Гары Падлесься адбылася вялікая ўрачыстасьць у чэсьць будзіцеля Галіччыны а. М. Шашкевіча. На гэтай урачыстасьці было каля 10 тыс. людзей.

Катэдра ўкраінскай літаратуры ў львоўскім унівэрсытэце. Школьныя ўлады львоўскага ўнівэрсытэту маюць стварыць катэдру украінскай літаратуры і дзеля гэтага пастанавілі зрабіць конкурс на прафэсара ўкраінскай літаратуры пры львоўскім унівэрсытэце.

УСДП процiў камуністаў і фашыстаў. На пачатку жніўня сёл. у Стрыі на паседжаньні Камітэту Падкарпацьця павадыры Украінскай Соцыял-Дэмократычнай Партыі (УСДП) выказаліся процiў усякага супрацоўніцтва і зносінаў з камуністымі і „Народным Фронтам,“ а так-жа рознымі фашыстаўскімі арганізацыямі.

Дзесяцілецьце Т-ва „Просьвіта“ ў Харбіне. 20—21 верасьня ў Харбіне, у Манджурыі, мае адбыцца ўрачыстае сьвятказаньне юбілею— дзесяцілецьця Т-ва „Просьвіта.“

Нацыяналістычная акцыя ў Савецкай Украіне. Савецкая газэта „Правда“ з дня 4 жніўня піша, што ў Савецкай Украіне „контррэвалюцыйны рух нацыяналістаў глыбака ўпусьціў карэньні.“ У Харкаве ў чыгуначных фабрыках выкрылі нацыяналістычную арганізацыю, якую падтрымлівалі нават сябры кампартыі. Нават і ў партыйным камітэце былі так-жа прыхільнікі нацыяналізму, якія стараліся бараніць „контррэвалюцыянэраў.“

У Днепрапётраўску нацыяналістычная група працавала пад кіраўніцтвам інж. Краснага і гэтая самая група брала ўдзел у процiўкамуністычных вулічных авантурах у Крэменчугу.

„Правда“ з 8 жніўня піша, што нацыяналісты хочуць ужо заўладаць Адэсай, дзе моцна разьвіваецца процiўкамуністычная прапаганда.

КУПЛЯЙЦЕ адзіны ў нас беларускі літаратурна-навуковы квартальны часапіс

„К А Л О С Ь С Е“,

у якім зьмяшчаюцца творы перадавых беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў.

Складка на „Калосьсе“: у год — 2 зл. на паўгода—1 зл., на асобную кніжку— 50 гр.

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі „КАЛОСЬСЯ“: Вільня, Завальная вул. № 1—2.

Źjezd
b. dziejačoŭ „Wyzwaleńnia“ i „Str. Chłopskaha.“

Paśla świata 15-ha žniŭnia, na jakim „Stronnictwo Ludowe“ wyjawiła swaje wialikija ŭpływy siarod polskaha sialanstwa, adbyŭsia ŭ Waršawie źjezd b. dziejačoŭ „Wyzwolenia“ i „Str. Chłopskaha.“ Hetyja dziejačy naradžalisia dziela zarhanizawańnia nowaj sialanskaj arhanizacyi, jakaja-b mahła abniać sialanskija masy, wyklučajučy Witasa i inšych pawadyroŭ „Str. Ludowaha.“ Na hetym źjeździe b. „chłopskija“ dziejačy wykazalisia za supracoŭnictwa z uradam. U hetym źjeździe prymaŭ učaście i b. „wyzwaleniec“ A. Šapiel.

Niamieččyna pawialičwaje armiju

Paśla abwieščańnia, što ŭ SSSR buduć brać u wojska na 2 hady małodšych nawabrancaŭ čymś heta było dasiul, u Niamieččynie ŭwiedziena 2 hady wajskowaj słužby. Hetyja źmieny ŭ wajskowaj słužbie pabolšwajuć armiju ŭ SSSR i ŭ Niamieččynie.

Nutranaja wajna ŭ Hišpanii

Nutranaja wajna ŭ Hišpanii nia spyniajecca. Zaŭziata i žorstka zmahajucca za ŭładu paŭstancy i zajadła boracca z paŭstancami respublikanski lewy ŭrad i lewa nastrojenyja masy.

Hetaja baraćba hišpancaŭ apošnimi časami pryniała wielmi žorstkija formy. Razahitawanyja masy ździekujucca nad duchawienstwam, manachami, palać kaścioły i manastyry. Ułady adnaje i druhoj starony rastreliwajuć swaich ideolohičnych praciŭnikaŭ, nie aščadžajučy nawat žančyn.

Frantowaja wajna tak-ža adbywajecca žorstka. Wajujučyja starony rastreliwajuć pałonnych i założnikaŭ.

Historyja znaje hišpanskija rewalucyi i daŭniejšyja, jakija tak-ža byli krywawyja i žorstkija. U 1820 h. padčas rewalucyi ŭ Hipšanii taksama niščyli kaścioły, palili manastyry i aryštoŭwali ksiandzoŭ. U 1823 h. wyhnali z Hišpanii 9 biskupaŭ i rastralali mnoha ksiandzoŭ. U 1834 h. byli tak-ža napady na manastyry, zamardawali 18 jezuitaŭ i 16 kapucynaŭ; tady wyhnali jezuitaŭ.

Z hetaha bačym, što žorstkaść chatniaj wajny ŭ Hišpanii pachodzić z psychiki hišpancaŭ i tych warunkaŭ žyćcia, u jakich wiakami prabywaje tamašniaje nasielnictwa.

—s—

U połymi chatniaj wajny ŭ Hišpanii katalonski aŭtanomny ŭrad šukaje sposabu wyzwalicca z pad hišpanskaj apieki i abwieścić Kataloniju niezaležnaj dziaržawaj.

дзеле. Выйшаў ён у школу а 8, а вяртаецца цяпер. Бацька, ты-ж толькі глядзі, як Тамаш наш, прышоўшы ў хату, абойдзецца! — Бацькі замоўклі, як сын іх пераступіў парог. Гэта быў старшы сын Якуба і Міхаліны, гадоў з 15 хлапец. Далікатны, ведама, маладое, як бацька, высокі, а з твару ён быў падобны да маткі. Тамаш кніжкамі ляпнуў аб стол і сказаў папольску: —Давайце есьці! — Абое бацькі маўчалі. Міхалінка, матка ані думала ўставаць з месца і карміць сына. Тамаш тады сеў ля стала, як урыты. Перад ім на стале ляжала крушня агуркоў і стаяў мёд у сподачку. Воддаль ад яго пад сьцяной ляжала некалькі рэпаў, бручак і стройнай морхвы. Школьнік ня ўкрануў нічога. Ён другі раз папольску сказаў: — Мама, дайце што есьці.—Тады матка на Якуба глянула і сыну адказала гэтак:

— Ня ведаеш, што рабіць, сынок, хлеб на стале, а рукі свае, бяры сам, ды еж!

— А што-ж там у школе чуваць? — пытаўся сына бацька.

— Па набажэнствах заўтра будзе бацькаўскі сход. Вучыцель загадаў нам сказаць гэта бацьком. На падручнікі трэба грошаў старацца, а многія, што езьдзілі вясной на выцечку, дык яшчэ дагэтуль не паплацілі.

Як скончыў сын, тады Якуб пачаў.

— Так... Але нам патрэбная беларуская школа і здабыць яе мы мусім — Тутака зазлаваўся Якуб. І трэба было бачыць разгневанага беларуса! Вочы яго тады блішчэлі, зьбялеў увесь ягоны твар, дольная ў яго губа траслася, зморшчыўся Якуба лоб, насунуліся яму бровы, а вушы яго пачырванелі.

— Заўтра пайду я на зборышча бацькоў — казаў — і высьпеваю ім усё, што на душы маей накіпела.

У хаце ўсё пацішэла. Нейкі сум агарнуў іх хату. Якуб далей за буракі ўзяўся. Ён да сябе прыклікаў Тамаша, свайго сына, і загадаў яму памагаць у рабоце. Тамаш зморшчыўся і ў нос чмыхнуў сваё гм... Але бацька на яго крыкнуў: —Я табе пакажу! —і Тамаш узяўся тады за работу.

Са школы ўжо вярталіся іншыя дзеці. Нахмураны прыйшоў Пятрусь. Яго вучыцель пытаўся лекцыі, а ён ня ўмеў адказаць. За гэта цяпер на яго бацька крыкнуў, а той, каб затушаваць усё адразу, ўзяўся за работу і памагаў матцы з агуркамі. Пятрусь гэта быў хлапец з Гіпалітам блізьняк, яны нейкія чатыры гады малодшыя за іх брата Тамаша. Гіпаліт таксама памагаў матцы нешта там капаючыся. Толькі адна дзяўчынка Гэлька, наймалодшая ў хаце, яна па школе узялася за кніжкі і адрабляла лекцыі. У хаце настрой быў несамавіты. Дзеці разумелі, што бацька іх быў злы.

За вакном ціха іграла восень. Пяяў пятух мусіць нейкую перамену, а ў траве стракатаў конік. Якуб выйшаў з хаты. Глянуў на вуліцу,— нікога там, ані душачкі. Усюды было ціха. Толькі цэп, або пранік то ў адным, то ў другім гумне разьлягаліся. Нейкі сум агарнуў сэрца Якубава.

Ён прысеў на сваім парозе і думаў пра сваю вёску Буду. У вёсцы гэтай быў касьцёл і царква і 7 кл. польская школа. Там змагаліся між сабой тры элемэнты. Першы элемэнт і найсільнейшы гэта былі беларускія сяляне, а яшчэ два элемэнты былі польскія. Поп у гэтай вёсцы спэцыяльна дзейнага жыцьця не праяўляў. Ён рабіў тое, што яму казалі рабіць. Затое ў гэтай парахвіі ксёндз, дык надта круціўся папанску. Ён на рэлігію глядзеў чыста папольску. Хто ў яго быў беларусам, той за каталіка ня лічыўся. З Якубам гэны ксёндз толькі афіцыяльна спатыкаўся, у школе на бацькаўскім сабраньні, або па калядзе ходзячы. Умеў Якуб і з ксяндзом агрызнуцца. Якуб у вёсцы меў сабе добрага суседа Максіма Забельскага. Яны ўдвух былі чуць правадыры ўсей вёскі. Будуць яны гдзе на сабраньні, — тады з імі рахуюцца ўсе. І цяпер Якуб думаў пайсьці да Максіма, каб угаварыцца з ім, як заўтра бараніць на зборышчы беларускую школу. Якуб ня вытрываў. Устаў і пайшоў у той бок вуліцы, гдзе жыў Максім. Адчыніў ён вароты ў панадворак Максіма, закашляў, але ніхто не спатыкаў Якуба. Якуб праз вакно паглядзеў у хату. Там хадзіў чорны кот па лаве, сярод хаты ляжала нейкая старая вопратка. Праз вуліцу і праз садок Якуб пайшоў далей, шукаючы Максіма. Урэшце знайшоў яго. Той у прылазьніку перабіраў бульбу.

(*Далей будзе*).

БЕЛАРУСЫ! Прысылайце ахвяры на фонд беларускай асьветы!—Пашырайце беларускае друкаванае слова! — Навучайце дзяцей чытаць і пісаць пабеларуску!

Roznyja wiestki

Z POLŠČY

Buduć dawać stypendyi sialanskim dzieciam. Pawodle rasparadžeńnia premjera Składkoŭskaha kožnaja wołaść z pačatkam hetaha školnaha hodu maje što hod wyznačać pa adnej stypendyi dla najzdalniejšaha wučnia siaredniaj škoły — sialanskaha syna. Stypendyja maje być pa 600 zł. u hod i trywać uwieś čas nawuki až da uniwersyteckich studyjaŭ uklučna.

Kolki zarablajuć pasiaredniki-handlary. U 1935 hodzie kansumenty ŭ Polščy zapłacili za rahataje bydła 291 mil. zł.: z hetaha ziemlaroby atrymali ŭsiaho 134 mil. zł., a reštu — 157 mil. zł. zabrali sabie ŭ kišeń pasiaredniki. Za drabniejšuju chatniuju žywiołu kansumenty zapłacili 568 mil. zł., praducenty (ziemlaroby) atrymali ledź 278 mil. zł., a pasiaredniki — 281 mil. zł. Takim čynam razam usiaho pasiaredniki zabrali sabie 438 mil. zł.

Wysłali ŭ Kartuskuju Berezu. 24 žniŭnia pasadzili ŭ Kartuskuju Berezu dwoch dziejačoŭ „Stronnictwa Ludowaha" Nitu St. z Šurawic i Ryncaža Wł. z Borku, Bochnienskaha paw., za toje, što 15 žniŭnia arhanizawali nielehalna sabrańni i demonstracyi sialan.

Z ZAHRANICY

Niemcy pieramohuć usich. Niamiecki pałk. Miler u swajej knižcy p. n. „Zmotaryzawanaja armija Hitlera", niadaŭna wyjšaŭšaj z druku, dawodzić, što za niekalki hadoŭ niamieckaja armija tak uzbroicca, što ŭ budučaj wajnie tolki za niekalki dzion zmoža pieramahčy ŭsich i tady zapanuje niamieckaja imperyja.

IV **źjezd sławianskich hieohrafaŭ i etnohrafaŭ.** Dnia 16-ha žniŭnia pačaŭsia ŭ Sofii, u Baŭharyi, IV-ty źjezd sławianskich hieohrafaŭ i etnohrafaŭ pry ŭčaści bolš 300 asob z roznych sławianskich krain aprača SSSR, z jakoha delehaty nia prybyli.

Rearhanizacyja kampartyi ŭ Francyi. 8 kanhres kamunistyčnaj partyi ŭ Francyi pastanawiŭ pieraarhanizawać partyju. U nowym statucie partyi skasawany rajony i padrajony, a na ich miesca ŭwiedzieny sekcyi, padparadkawanyja rajonnym abjadnańniam. Kanhresy buduć adbywacca što dwa hady. Aprača hetaha zmocnieny stanowiščy centralnaha kamitetu i politbiura partyi, a tak-ža ŭpłyŭ Kaminternu. Kamintern budzie zaćwierdžwać pastanowy ab sklikańni partyjnaha kanhresu. Aprača taho ŭsie pastanowy Kaminternu abawiazwajuć francuskuju kamunistyčnuju partyju.

„Narodny Front" u Kitai. U Kitai arhanizujecca „Narodny Front" na eŭrapejski ład. Da taho frontu ŭwachodziać arhanizacyi, što nie naležać da Kamintanhu i imknucca da adradžeńnia Kitaju i pieramohi čužych imperjalizmaŭ. Niekatoryja časapisy ćwierdziać, što kirujuć hetym frontam sawieckija dziejniki.

Piśmy z wioski

Rewizyja ŭ hurtku B.I.H. i K.

Charki, Pastaŭskaha paw. U našym hurtku Bieł. Inst. Haspadarki i Kultury nadowiačy adbyłasia rewizyja. Referent biaśpiečnaści pierahladaŭ knihi kancelaryi hurtka. U śpisie siabroŭ adznačyŭ, što niama rubryki „nacyjanalnaści" i „kolki hadoŭ." U kasawaj knizie adznačyŭ, što jana nie prašnurawanaja i nie padpisanaja wojtam. Pierahledzieŭ taksama i biblijateku.

Urad hurtka ŭsie wymahańni rewidenta ŭžo wykanaŭ.

Pry hetym treba adznačyć, što naš hurtok sioleta ŭzmacniaje dziejnaść u kirunku samaaświety. Dziela hetaha wypisaŭ užo niekalki nowych knižak.

Sapraŭdy treba pašyrać i pahłyblać wiedu praz samaadukacyju, bo wučycca ŭ škole nia ŭsie mohuć i nie dla ŭsich nawuka ŭ škole dastupnaja.

Kar.

Нашыя валасныя справы.

Дзятлава, Навaградзкага пав. У мінулым годзе я пісаў аб нашых валасных справах, пішу і цяпер аб іх. Надовячы быў у нашай валасьці кантроль з Навaградка і правяраў кнігі. Уночы з 14 на 15 жніўня выбухнуў у валасным будынку пажар, але агонь стушылі. Валасныя кнігі забралі ў Навaградак дзеля падрабязнага разгляду.

У нашай валасьці беларускіх арганізацыяў няма. Былі спробы закладаньня беларускіх арганізацыяў, але не ўдалося. Культурная праца вядзецца саматугам — выпісываюць нашыя людзі газэты і кніжкі ўскладчыну і гэтак прасьвячаюцца. Ёсьць нясумленныя і цёмныя адзінкі, якія ў гэтай справе перашкаджаюць: яны распушчаюць чуткі, што гэтая саматужная прасьветная праца пабеларуску гэта камуністычная работа. Яны называюць „Бел. Крыніцу," „Шлях Моладзі" і іншыя беларускія газэты камуністычнымі і гэтак застрашваюць людзей Картускай Бэрэзай.

Школьную акцыю весьці ў нас вельмі цяжка.

С—кі.

Našaje žyćcio.

Warapajewa, Pastaŭskaha paw. Ciažka žywiecca našym ludziam. Na drobnych haspadarkach nie razžywieššia. Sioleta ničoha nia wyrasła — usio wysachła ad śpiakoty: prapała žyta, prapała jaryna, nia wyrasła i siena; adna nadzieja na bulbu, kali ciapierašnija daždžy nia zhnojać jaje.

Žywioły lišniaj u našych sialan niama, a ciapier i tuju treba pradać, bo nia budzie čym zimoj karmić. Pahroza hoładu ŭžo ciapier lezie pad sialanskija strechi. Adrazu pačało ŭžo daražeć zbožža: žyta było pa 1 zł. 50 hr. za pud, a ciapier płaciać pa 2 złotych.

Našyja sialanie šukajuć zarabotkaŭ, ale i znajšci ŭsim trudna. Jakija zarabotki jość, dyk i tyja marnyja. U našaj fabrycy za doŭhi dzień pracy płaciać pa 1 zł. 50 hr. — pa 2 zł., ale j hetaj zaroblenaj płaty adrazu atrymać trudna i treba paniekalki razoŭ chadzić pa swaje hrošy.

Woś, jakoje našaje žyćcio, woś, jakaja mahčymaść haspadarčaha raźwićcia našaha sialanstwa.

Našyja wiaskoŭcy daŭno čakajuć ziamielnaj reformy i nia traciać nadziei i ciapier, što dačakajuć nadziełu ziamloj.

A heta nadta patrebna dla našaha sialanstwa. Jnakš, h. zn. biez nadziełu biezziamielnych i małaziamielnych sialan ziamloj, žyćcio našaha sialanstwa nie paprawicca. Ziamielnaja reforma patrebnaja nahwałt.

M—č.

Прасьвячаймася саматугам.

Косаўскі пав. Цяжка жывецца ў нашых вёсках ня толькі з боку матар'яльнага, але таксама і з боку духовага. Моладзь ня мае сваей арганізацыі, а польскія арганізацыі нашай моладзі ня могуць зацікавіць.

Апошнімі часамі перасталі даходзіць у нашыя вёскі беларускія газэты і вяскоўцы ня маюць чаго чытаць.

У нашых ваколіцах беларусаў называюць паляшукамі, а беларускую мову „тутэйшай," але нашыя людзі ведаюць, што яны беларусы і „тутэйшая" мова гэта мова беларуская.

Сёлета ў вёсцы Сенькевічах засноўваўся гурток Бел. Інст. Гасп. і Культуры, але не зарганізаваўся. Пасьля паданьня заявы ў староства з просьбай залегалізаваць гурток Б.І.Г.іК., паліцэйскі прывёз паведамленьне закладчыкам, каб зьявіліся ў староства. Закладчыкі паехалі, пагаварылі з начальнікам бясьпечнасьці, былі ў паветавай камандантуры паліцыі, дзе таксама аб гэтым пагаварылі і вярнуліся дамоў. Якія вынікі гэтых гутарак і як яны гаварылі, ведаюць ня толькі закладчыкі гуртка БІГіК, але і многія іншыя.

Прыходзіць восень, дык пара думаць аб самаадукацыі. Трэба выпісываць беларускія кніжкі і газэты і праводзіць самаасьвету — трэба няграматных вучыць чытаць і пісаць і заахвочваюць усіх чытаць газэты і кніжкі.

С. З—ы.

Шыкавічы, Мядзёльскай вол. Пастаўскі пав. Пішуць людзі з усіх бакоў, напішу і я аб горкім жыцьці сваей вёскі.

Вёска нашая не вялікая, складаецца з 50 гаспадарак, з насельніцтвам 260 чалавек.

Жыхары — праваслаўныя беларусы, але мала сьведамыя, хоць ёсьць такія, што прачытаюць газэту і «наказ платнічы.»

Зямлі маем вялікі кусок, але што з таго, калі карысьці мала — пяскі і дзікія балоты. Вёска мае 7 валок, а валока 107 дзесянцін. З гэтай зямелькай маем многа бяды: падатку многа, зямля далёка, работы шмат, а ўраджай заўсёды слабы. Словам, нам жывецца дрэнна і, як кажа мяйсцовая прыказка — каб ня лес і вада, была-б чыстая бяда. Толькі з гэтых двух жаролаў маем сякі-такі даход: у возеры ловім рыбу і маем прыкід да стравы, а з лесу носім грыбы, прадаём і гэтым апраўдываем падаткі і другія расходы.

Моладзь, так як і ў другіх мясцовасьцях, жыве у страшна цяжкіх варунках. Нястача заробкаў даводзіць моладзь да трагічнага стану. Дзеці ўзгадоўваюцца ў цемнаце, бо ня маюць сваей роднай школы.

Грамадзяне бацькі! Хоць самі цёмныя, дбайма болей аб дзяцей, выпісвайма ім беларускія лемантары і ўсякія іншыя кніжкі, бо чалавек цёмны ў будучыні, гэта толькі парабак у другіх.

Вясковы

Dr. Jadwiha i dr. Stanisłaŭ Hrynkiewičy.

5)

Jak pawinna trymacca kormiačaja žančyna.

Časta čuwać narakańnie maciary na toje, što ŭ hrudziach maje mała kormu. Žančyny musiać mocna pawieryć u toje, što treba im wykarmić dzicia hrudźmi i chaj buduć peŭnyja, što korm budzie, za nadta nialikimi wyniatkami. Chacia-b na't u pieršych paru tydniach i było maławata małaka ŭ hrudziach, dyk rehularnaje prystaŭlańnie dziciaci wykliča štoraz bolšy jahony prypłyŭ. A kali-b na't nowarodžany pačatkawa i nia nadta kłuścieŭ, dyk mienš jamu henym paškodzicca, čym zusim nia kormiačy hrudźmi, a dajučy karowiačaje małako.

Časam płač hałodnaha dziciaci wyklikaje ŭ kachajučaje maciary prypłyŭ małaka da hrudziej. Dyk treba tolki chacieć i wieryć, a korm u najbolšaj čaści nojdziecca.

Dobry korm miecimie maci tady, kali nia budzie zašmat abjadacca, a jeścimie i picimie tolki zdarowyja pradukty, kali budzie ŭ mieru pracawać, budzie dychać świežym pawietram, nia budzie prastudžywacca, spać stolki, kolki joj treba, kab adpačyć i silnaj ustawać da raboty.

Ježa kormiačaje žančyny chaj nia budzie lišnie adnastajnaju, kab „nia pryjełaś". Miasa jeści tolki z jarynami, nie rabić strawaŭ zawostrych, nia brać zašmat piercu, soli, woctu, harčycy i h. d.

Z redkich strawaŭ karysnyja: rasoł, słabaja harbata z małakom, cukram, małako sałodkaje, kisłaje, maślanka, słabaja małočnaja kawa, najlepšy napitak heta čysta wada z cukram abo niejkim sokam.

Z inšych praduktaŭ možna jeści: chleb, bułku, zialony haroch, kalafjory, kampoty z fruktaŭ świežych i sušanych, morkwu, jahady, miod, bulbu, razwaranyja i pracedžanyja krupy jačmiennyja, pšonnyja, pansak, ryž, sačeŭku, špinak; jajcy ŭ roznajakaj formie, z miasaŭ — cialacinu, hałuboŭ, świežuju, chuduju kaŭbasu, świnoje chudoje miasa, zajačynu, ščupaka.

Nie pawinna kormiačaja žančyna jeści abo pić, dziela taho što mohuć paškodzić dziciaci, nižej padadzienych napitkaŭ: sadowaje wady, limanady, mocnaha piwa, likieru, wodki i ŭsiaho taho, što maje ŭ sabie alkahol.

Stałyja pradukty, jakich lepš nia jeści na toj čas: bruška, časnyk, cybula, chren, hryby, karnišony, kalarepa, kapusta, cynamon, haździki, muškatułnaja hałka, šafran, pierac, hurki, piatruška, redźka, repa, šparahi, sałata, husiacina, kačacina, harčyca, sieladcy, kłustyja ryby, wendžanyja kaŭbasy i ahułam usio wendžanaje i marynowanaje miasa. Kormiačaja žančyna musić pić časta, kab korm nia byŭ lišnie husty i kab nia było suchaści ŭ horle, što ŭ kormiačych bačycca dawoli časta. Najbolš zdarowym napitkam, jak heta było ŭžo skazana, budzie čystaja pierawaranaja wada z cukram abo sokam.

Časta maciary dumajuć, što wypiŭšy bolšuju kolkaść małaka, abo źjeŭšy šmat poliŭki z muki, krup i małaka, pamohuć wydzialacca chutčej małaku z hrudziej. Hetak rabić nia možna, dziela taho, što hetkaja ježa chutka nadaješć, žančyna pačynaje kłuścieć i prapadaje ŭ jaje małako. Usieńka treba rabić umieru.

Zamiest wady možna rabić napitak naparyŭšy harbaty z kropu, anyžku, kminu. Harbaty henyja pamahajuć wydzialać bolš małaka z hrudziej, a prachodziačy z małakom u straŭnik dziciaci, wyhaniajuć hazy z kišok i dzicia nia maje tady ŭzdućcia trybuška.

Dobra taksama pakłašci kusok pałatna, zmočanaha ŭ hetkaj harbacie, na hrudzi i lohka ich abwiazaŭšy pakinuć na niekalki hadzin.

Świežaje pawietra wielmi patrebnaje maciary, u roŭnaj miery patrebnaje jano j dziciaci. Kormiačaja žančyna musić prynamsia adnu-dźwie hadziny być na pawietry. Nadta dobra pracawać, jasna — nie pierapracoŭwajučysia. Lepš nie tancawać, niajeździć wiarchom na kani.

Spać musić žančyna 8 hadzin na dzień, ale tolki ŭnačy, nikoli ŭ dzień. Kormiačaja žančyna musić być spakojnaju, zdawolenaju, wiasiołaju. Raptoŭny sum, tuha, abo raptoŭnaja radaść, pierepałach mohuć paškodzić na małako. Dzicia dastaje wolnaści, wanitaŭ, ŭzdućcia trybuška, kolkaŭ, harački a na't kanwulsijaŭ. Bywała ŭ takich nahodach, što dzicia na't pamirała. Lepš tady zaŭsiody adciahnuć małako, a tolki adčakaŭšy paru hadzinaŭ, prystawić dzicia da hrudziej.

Rupliwaść ab čyściniu abawiazuje i tutaka žančynu. Kupacca treba kožny tydzień. Saročki, chuścia, kab byli zaŭsiody čystymi i wyhadnymi. Hrudzi padwiazywać ŭwierch, kab nie apadali. U źwisajučych hrudziach korm moža zastajwacca i być pačatkam zapaleńnia hrudziej.

Kormiačaja chaj budzie nadta aściarožnaju z lakarstwami ŭ jakich jość wodka, z lakarstwami na wolnaść (rycyna, senes), nasonnymi, dziela taho što henyja leki, łučyŭšy ŭ małako, mohuć paškodzić dziciaci.

Užo ŭ ciažku treba, kab žančyna abmywała hrudzi chałodnaju wadoju abo wodkaju, źmiešanaju z hlicerynaju (10 čaściaŭ hliceryny na 90 čaściaŭ wodki). Barodaŭki nia treskacimuć, kali dzicia budzie smaktać i smaktańnie nia budzie wyklikać boli.

Kali adnak barodaŭki ŭ kormiačaj treskajuć, tady smaktańnie robić časta niaznosnyja boli. Robiacca rany, rany henyja mohuć zarazicca ad niačystaty i wyraście skuła.

Pry hetkich woś treščynach treba barodaŭki abmyć, wycierci i šmarawać wodkaju z hlicerynaju (jak wyšej), paru razoŭ na dzień. Kab ranki chutčej hailisia, dobra ich pašmarawać 2% lapisam.

Hrudzi trymać čysta i ciopła. Paśla karmleńnia dziciaci wymyć barodaŭki čystaju pierawaranaju, letniaju wadoju. Nia ściskać ich nadta šniuroŭkaju. Myć barodaŭki pierad karmleńniem.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič